УДК 947,6 (“1921–1939”)

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД І МАТЭРЫЯЛЬНЫ ДАБРАБЫТ НАСЕЛЬНІЦТВА ДРАГІЧЫНСКАГА ПАВЕТА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА Ў 1921–1939 гг.

***В. П. Гарматны***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
Інстытут гісторыі НАН Беларусі

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя нацыянальныя групы насельніцтва Драгічынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг., аналізуецца іх прафесійная занятасць, што станавілася асноўнай перадумовай узроўню матэрыяльнага дабрабыту і спецыфікі ўзаемаадносін паміж імі.*

**Ключавыя словы**: Драгічынскі павет, нацыя, беларусы, палякі, яўрэі, лабары.

## Уводзіны

На працягу 1921–1939 гг. Драгічынскі павет уваходзіў у склад Палескага ваяводства і з’яўляўся часткай міжваеннай Польшчы. У гэты час Драгічынскі павет знаходзіўся ў цэнтры ваяводства і быў тут самым малым па плошчы паветам, але разам з тым адным з самых густанаселеных. На 30 чэрвеня 1921 г. плошча Драгічынскага павета складала 2 352 кв. км, што ахоплівала большую частку сучасных Драгічынскага (без заходняй і паўднёва-заходняй часткі) і Іванаўскага (заходняя і цэнтральная частка) раёнаў Брэсцкай вобласці), а таксама вёскі Горкі, Мукашын і Любацін, якія зараз уваходзяць у склад Любяшоўскага раёна Валынскай вобласці Украіны [1, с. 32].

## Асноўная частка

Пры даследаванні нацыянальнага складу насельніцтва Драгічынскага павета асаблівую цікавасць уяўляюць матэрыялы першага ўсепольскага перапісу ад 30 верасня 1921 г. Згодна з ім на той час у павеце пражывала 63 192 чалавекі (30 122 мужчыны і 33 070 жанчын) – сярэдняя шчыльнасць насельніцтва тут складала 26,8 чалавек на на кв. км (па ваяводству – 20,8) [2, s. X–XI; 3, s. 17]. З іх беларусаў налічвалася 18 426, “тутэйшых” (“мясцовыя”, не маглі самастойна вызначыць уласную нацыянальнасць) – 25 407, палякаў – 9 188, яўрэяў – 6 024, украінцаў – 3 693, рускіх – 434, акрамя таго, 1 чалавек наогул вызначыў сябе касмапалітам [4, s. 21; 5, с. 25].

© Гарматны В. П., 2025

Наступны перапіс праведзены ў 1931 г. і зафіксаваў на Драгічыншчыне наяўнасць 97 040 жыхароў (паводле іншых звестак – 90 995, з іх беларусаў – 78 686, яўрэяў – 4 291, палякаў – 4 295), шчыльнасць насельніцтва – 41,3 (30,9) адпаведна [6, с. 116]. Істотнае змяншэнне долі яўрэяў можна растлумачыць перш за ўсё працэсамі масавай эміграцыі. Разам з тым матэрыялы перапісу 1931 г., па меркаванню многіх айчынных навукоўцаў, былі істотна сфальсіфікаваны ў справе завышэння долі палякаў. Паводле ацэнак даследчыкаў, тэмпы прыросту насельніцтва на Палессі былі самымі высокімі па ўсёй Польшчы і нават па Еўропе ў цэлым. Акрамя таго, пасля 1921 г. у родныя мясціны вярнулася істотная частка мясцовых жыхароў, якія ў перыяд Першай Сусветнай вайны вымушана сталі бежанцамі і трапілі ў асноўным у расійскія губерні.

Вялікую цікавасць уяўляе таксама перапіс коней 1927 г., згодна з якім у Драгічынскім павеце налічвалася 18 040 сялянскіх гаспадарак, з якіх 2 080 наогул не мелі цяглавай жывёлы, 1 каня – 10 443, 2 – 807, 3 – 50, 4 – 13, 5 і больш – 23, таму ў цэлым асноўную масу мясцовых сялян можна аднесці да беднякоў і серадлякоў [7, с. 193].

Беларусы былі пераважнай большасцю мясцовага насельніцтва, але пры гэтым адносна сацыяльнай лесвіцы заставаліся на самым нізе, з’яўляліся ў асноўным сялянамі альбо местачкоўцамі, якія захоўвалі цесныя сувязі з сельскай гаспадаркай. У адносінах да беларусаў польскімі ўладамі праводзілася дыскрымінацыйная палітыка, перш за ўсё забаранялася выкарыстоўваць беларускую мову ў дзяржаўных установах, а невалоданне польскай мовай расцэньвалася як непісьменнасць. У многіх выпадках station ацэньвалася ідэнтыфікацыя сябе ў якасці перш за ўсё палешукоў, што разглядалася як пераходны этап на шляху да прызнання сябе палякамі [8, с. 46–47].

У сувязі з цяжкімі бытавымі ўмовамі шмат хто з мясцовых жыхароў вымушаны быў эміграваць у краіны Заходняй Еўропы, ЗША і

Канаду. Варта адзначыць, што пры гэтым ствараць сем'і перасяленцы імкнуліся пераважна з землякамі. Напрыклад, 18 студзеня 1938 г. жыхар вёскі Завялеўе гміны Брашэвічы Еўтух Мамацюк у прысутнасці сведкаў падпісаў дазвол сваёй дваццацігадовой дачцэ Алене на выезд у Аргенціну і шлюб з Якубам Скрыпелем, які пражываў у Буэнас-Айрэсе [9, арк. 2].

Сярод тагачасных сялянскіх забудоў з саламянымі стрэхамі асабліва яскрава вылучаліся ладныя хаты рээмігрантаў з ЗША, якія звычайна былі пакрыты бляхай [10, s. 113]. Як успаміналі мясцовыя старажылы, на той час людзі хоць і жылі небагата, але крадзяжоў амаль не было, таму замкоў на дзвярах пераважна не было і звычайна яны запіраліся на дручок. Закрывалі хату на вісячы замок толькі тады, калі збіраліся ехаць куды-небудзь на некалькі дзён, як напрыклад на вяселле. Баяліся толькі вандроўных цыган, якія маглі абакрасці [11, с. 111].

У адным з краязнаўчых альманахаў, падрыхтаваных мясцовымі вучнямі, давалася наступнае апісанне сялянскага быту мястэчка Янава (Іванава) Драгічынскага павета: "На малой незабрукаванай вуліцы стаіць хата, нізкая, крытая саломай, якая хаваецца пад слоем моху, што сведчыць пра даўнасць гэтай халупкі. Не можа гаспадар з-за сваёй беднасці пабудаваць сабе новую хату. Беднасць выглядае з-пад паламанага плота і хлява. Відаць яе паўсюль. Уваходзім у хату. Хата ўсярэдзіне здаецца яшчэ ніжэйшай. У першым пакоі, які завецца "хатай", знаходзіцца стол, а ўздоўж сцен стаяць лавы. У куце – печ, вельмі вялікая, займае амаль 1/6 усяго памяшкання, а каля яе – ацяпляльная печ – "грубка". За гэтай печчу ўдоўж сцяны на лавах-услонах пакладзены дошкі – нары. Гэта так званы "запык".

Звычайна там спяць дзеці. Колькі іх ёсць, усе яны спяць на тым "запыку", адны ўздоўж, другія ўпоперак. З "хаты" дзверы вядуць у маленькі пакой з адным акенцам. У пакоі гэтым, званым "вышчэбка", захоўваюць хлеб, малако, масла, сыр і ў невялікай колькасці сала, стаяць там бочкі з агуркамі і капустай. За "вышчэбкай" знаходзіцца камора. Там захоўваюць гародніну, збожжа і некаторыя запасы на зіму. Стаіць там ложак, збіты з дошак, на якім спяць у летнюю пару. Хатні рыштунак бедны. Упрыгожванняў на сценах няма. Калі ў хаце ёсць дзіця, якое ходзіць у школу, то часам на сценах можна пабачыць яго малюнкі... Доўгімі восеньскімі вечарамі, пры свеце керасінавай лампы сядзіць на лаве гаспадар у шапцы, адпачывае пасля цяжкай працы, а гаспадыня мые посуд пасля вячэры – абодва маўчаць. На пытанні гаспадар неахвоча адказвае і чакае знаку жонкі, калі можна ісці спаць" [12, с. 128].

Сялянам Драгічыншчыны часцяком не хапала сродкаў нават на самае неабходнае. Так, напрыклад, жыхар Бездзежа А. Чайноўскі звяртаўся да мясцовага ксяндза Яблоньскага з просьбай знізіць аплату за хрышчэнне дзіцяці з 5 злотых да 1, але той адказаў, што правядзе тады абрад у скарочанай форме [13, с. 25–26].

Акрамя таго, цікавую этнасацыяльную групу таксама ўяўлялі лабары (назва хутчэй за ўсё паходзіць ад лацінскага *labor*, што значыць "праца"), якія па-свайму роду дзейнасці сталі зборшчыкамі ахвяраванняў на пабудову альбо рамонт праваслаўных цэркваў, а таксама гандлярамі рознага роду рэлігійных тавараў [14, s. 75–76]. З цягам часу ва ўмовах агульнага малазямелля гэта, па сутнасці, аформілася ў асобны промысел, сведчаннем чаго з'яўляліся здольнасці лабароў пры дапамозе няхітрых прылад выклікаць "цуды" (перш за ўсё "плач" ікон), што рэзка павялічвала аб'ёмы збіраемых сродкаў. У выніку лабары сталі прафесійна займацца зборам ахвяраванняў сярод вернікаў, за што атрымлівалі ўзнагароджанне ад святароў, дабіраліся ў сваіх вандроўках перад вайной нават на Волгу, у Крым і на Каўказ і з мэтай непрыкметна прысабечыць сабе частку грошай выпрацавалі сваю асобную мову. Сярод найбольш характэрных для лабароў слоў можна адзначыць: хлеб – кумса, сала – крыса, яйка – кіта, царква – клюса, хата – хіза, паляк – ланько, яўрэй – кудлай [15, с. 294–295].

Знешні выгляд лабароў не адрозніваўся ад мясцовых палешукоў – сярэдні рост, цёмныя валасы і вочы, светлы твар з правільнымі рысамі. Галоўная розніца змяшчалася ў вопратцы – лабары звычайна насілі кароткі кажух з рамянным кушаком, скураныя боты з доўгімі халявамі і чорную суконную шапку з брылём. Святочная вопратка складалася з шэрай сярмягі з чырвонымі адваротамі на рукавах і вялікай шапкі з сівой аўчыны.

Янаўскія лабары былі вядомы як дбайныя гаспадары, хата і двор якіх заўсёды трымаліся ў поўным парадку. Жыллё іх з даўняга часу звычайна было аднатыпным, але больш багатым у параўнанні з суседзямі, уяўляла сабой невялікую пабудову прыкладна 5 метраў даўжыні і 4,2 шырыні з чатырма вокнамі. Да хаты прыбудоўваліся сені і клець, падлога

рабілася з дошак. У кожнай хаце вісела па некалькі розных абразоў. Акрамя хаты, меліся хлеў для жывёлы, гумно і некаторыя іншыя пабудовы. Адразу за хатай расло некалькі садовых дрэў, астатняя зямля пакідалася пад агарод [16, с. 60].

Палякі былі самай прывеліяванай часткай навакольных жыхароў і пры адноснай нешматлікасці займалі самыя высокія і адказныя пасады ў дзяржаўнай адміністрацыі, самакіраванні, паліцыі і чыгунцы, ахоплівалі большасць мясцовых буйных землеўласнікаў. На жаль, прадстаўнікі польскай адміністрацыі больш высокага рангу на гэтых землях былі людзьмі прыезжымі і чужымі. Напрыклад, паводле ўспамінаў навакольнага землеўласніка Францішка Віславуха, адзін з драгічынскіх павятовых стараст, пан Х., родам з-пад Жэшува, даведаўся, што хомскі равін падчас Польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. ратаваў ад бальшавікоў польскіх жаўнераў з 16-й Познаньскай дывізіі, якія потым адзначалі яго як надзвычай мужнага чалавека [17, s. 141–142]. Стараста вырашыў узнагародзіць равіна і загадаў свайму сакратару тэрмінова выклікаць таго, але пры гэтым не растлумачыў прычыны. Сакратар перадаў загад драгічынскага старасты каменданту паліцыі, а той свайму намесніку і ў рэшце рэшт равіна даставілі ў Драгічын пад арышт, сам жа павятовы стараста быў на той час на паляванні і ў выніку даведаўся пра ўсё гэта толькі з газет [18, s. 106–111].

Польскія ўлады на той час усяляк прапаведавалі сваю тут нібыта цывілізатарскую місію і ўсяляк заахвочвалі перасяленне сюды рознага роду каланістаў, перш за ўсё асаднікаў, перадавалі ім на стварэнне новых гаспадарак зямлю, сельскагаспадарчы інвентар, дрэва на забудовы і выдавалі льготныя банкаўскія крэдыты. Гаспадаркі асаднікаў павінны былі стаць узоравымі для навакольных сялян, акрамя таго, яны выконвалі тут шматлікія паліцэйскія функцыі, сачылі за палітычнымі настроямі навакольных жыхароў і актыўна ўдзельнічалі ў ажыццяўленні паланізацыі, перш за ўсё праз стварэнне рознага роду суполак, кааператываў і адкрыццю народных дамоў. Асадніцкія арганізацыі ўзніклі вясной 1921 г. у Драгічынскім павеце аднымі з першых, бо тут пасялілася найбольшая колькасць каланістаў, але ў цэлым яны ацэньваліся як слабыя і вузка спецыялізаваныя [19, с. 439]. Разам з тым нягледзячы на такую актыўную падтрымку асаднікі ў цэлым пераважна не змаглі ў надзвычай складаных умовах арганізаваць належным чынам асабістую гаспадарку, сведчаннем чаго стала наяўнасць у большасці з іх запазычанасцяў па крэдытам, а ў выніку па матэрыяльнаму становішчу галоўную масу асаднікаў можна было аднесці да сераднякоў. Аднак у 1925 г. на з'ездзе асаднікаў у Драгічыне адзначалася, што адносіны з навакольнымі сялянамі былі надзвычай добрымі дзякуючы актыўнай працы перасяленцаў, але пры гэтым узнікаюць істотныя сумненні ў добрасумленнасці высноў [20, s. 220].

У свядомасці беднай часткі мясцовага насельніцтва памешчыкі-палякі і асаднікі выступалі звычайна як прыгнятальнікі і прадстаўнікі пануючай нацыі. Для простага палешука, жыццё якога ў асноўным складалася з цяжкай фізічнай працы, што пераважна забяспечвала мінімальны ўзровень выжывання сям'і, у выніку свет "польскага пана" быў недасягальным і чужым [15, с. 309]. Разам з тым у 1936 г. сяляне вёскі Закозель у якасці сведкаў дапамаглі свайму памешчыку Каралю Талочка выйграць справу ў Пінскім акруговым судзе, бо пацвердзілі, што яго маёнтак паспяхова развіваецца, таму ў бліжэйшы час ён выплаціць усе пазыкі, у тым ліку ўзятыя ў яўрэяў [21, с. 54–55].

Яўрэі былі найбольш заможнай часткай насельніцтва Драгічыншчыны, пражывалі пераважна ў мястэчках і былі ў асноўным заняты ў сферы гандлю і рамяства. Частка з іх разам з тым атрымлівала ад сваякоў з ЗША грашовыя пераводы. У цэлым дзякуючы яўрэям стварыліся ўмовы для больш актыўнага эканамічнага развіцця і паступовай тэхнічнай мадэрнізацыі навакольнай вытворчасці. Напрыклад, у Хомску ў 1938 г. дзякуючы пабудове электрастанцыі для абслугоўвання паравых млыноў яўрэйскіх прадпрымальнікаў удалося таксама асвятліць дзве галоўныя вуліцы [22, с. 27].

Стаўленне да яўрэяў сярод навакольнага насельніцтва ў цэлым было нейтральным і залежала ў першую чаргу ад асабістых якасцей іх асобных прадстаўнікоў. У цэлым яўрэі добра ладзілі з мясцовым насельніцтвам, у якасці выключэння можна ўзгадаць толькі тэатралізаваны гандаль у форме псіхалагічных спаборніцтваў падчас набыцця рознага роду тавараў, у якім прымалі актыўны ўдзел абодва бакі і які забываўся адразу пасля заключэння здзелкі. Разам з тым яўрэі славіліся ўменнем дамаўляцца з "карыснымі людзьмі", ад якіх многае залежыць (перш за ўсё рознага роду адміністратарамі і асабліва правяраючымі),

і ўменнем знаходзіць выхад з самых, здавалася б, безнадзейных сітуацый, таму ў народзе былі досыць папулярнымі жарты, у якіх яўрэі выстаўляліся беспрынцыпнымі гандлярамі. Аднак пры гэтым яўрэям былі ўдзячны за дапамогу ў набыцці каштоўных тавараў, бо простаму селяніну з гэткімі справамі самастойна аніяк не справіцца [23, с. 149; 24, s. 90].

Праявы антысемітызму ў асноўным абмяжоўваліся адзначанымі вышэй скептычнымі жартамі, аднак у крайніх выпадках назіраліся асабістыя канфлікты, якія часам маглі перарасці ад пагроз да фізічнага ўздзеяння. У сувязі з гэтым варта прывесці наступны выпадак: у ліпені 1939 г. 63-гадовы жыхар горада Драгічына Шмуль Мілнер, рэзчык мяса, скардзіўся на знявагу з боку сакратара мясцовай гміны Станіслава Філіпекі. 14 ліпеня Мілнер прыйшоў ранкам да гміннай управы з просьбай аддаць яму фартух рэзчыка, які перад гэтым разам з мясам у яго забрала паліцыя і перадала ўладам. Сакратар адмовіў і груба абразіў прасіцеля, у сваю чаргу Мілнер сказаў, што перад ім не селянін з вёскі Гутава, якому той калісьці выбіў зубы. На гэта Філіпек сказаў: “Я табе лепей дам!” – і ўдарыў яго кулаком у галаву, а затым выштурхаў за дзверы і даў нагой па тыльным месцы. У нядзелю 16 ліпеня Філіпек прыйшоў у лаўку да Мілнера, які ў гэты час рэзаў мяса, і забараніў працаваць у гэты дзень, на што ўладар лаўкі адказаў, што аддаць такі загад могуць толькі павятовы староста і ўправа, на што Філіпек паведаміў, што яны яму не ўказ. Пры разборы дадзенай справы адзначалася, што Філіпек вядомы сваімі “брутальнымі паводзінамі” і яму нельга больш патураць [25, арк. 15, 16]. Далейшы ход справы невядомы і быў перарваны пачаткам Другой Сусветнай вайны.

У адносінах да рускіх можна адзначыць, што яны складалі нешматлікую групу насельніцтва, але разам з тым сярод іх налічваўся шэраг буйных землеўласнікаў. Напрыклад, уладальнік маёнтка Баландзічы А. І. Кіслоўскі быў вядомы як рускі манархіст і дзякуючы шырокай падтрымцы часткай навакольнай інтэлігенцыі здолеў абрацца ў Сейм на выбарах 1928 г. [26, с. 64].

### Заключэнне

На працягу 1921–1939 гг. насельніцтва Драгічынскага павета мела поліэтнічны нацыянальны склад з захаваннем прывеліяванага стану палякаў. Пры гэтым найбольш заможнай і эканамічна актыўнай часткай мясцовых жыхароў былі яўрэі, якія па сутнасці сканцэнтравалі тут у сваіх руках гандаль і рамяство, стваралі для сваіх суседзяў шмат працоўных месцаў. Беларусы складалі дамінуючую большасць жыхароў, але па сацыяльным стане пераважна былі сялянамі, якія істотна пакутавалі ад малазямелля і адносна невысокай ураджайнасці ворных зямель, таму іх матэрыяльны дабрабыт заставаўся даволі слабым, патрабаваў пошуку дадатковых сродкаў існавання. У цэлым адносіны паміж асноўнымі нацыянальнымі групамі пераважна заставаліся пазітыўнымі пры схаванай незадаволенасці польскім панаваннем тут, а таксама праяўленні ў некаторых выпадках бытавога антысемітызму.

### *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. **Максімовіч, Ю. П.** Некаторыя асаблівасці размяшчэння насельніцтва ў Драгічынскім павеце / Ю. П. Максімовіч // Загароддзе-1 : мат. Міждысц. навук. семінара па пытаннях даслед. Палесся, Мінск, 19 верасня 1997 г. – Мінск : БелІПК, 1999. – С. 32–33.

2. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników pierwszego powszechnego spisu ludności z dnia 30.09.1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa : GUS, 1924. – 95 s. – T. 3. Województwo Poleskie.

3. ***Tomczonek, Z.*** Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek. – Bialystok : Wydawnictwa Politechniki Bialostockiej, 1996. – 246 s.

4. ***Cichoracki, P.*** Województwo Poleskie 1921–1939. Z dziejów politycznych / P. Cichoracki. – Łomianki : LTW ; Wrocław : IH Uniw. Wrocławskiego, 2014. – 477 s.

5. ***Пашкович, Е. И.*** Административно-территориальное устройство и социально-демографическая ситуация на землях Ивановского района в составе Польши в 1920-х гг. / Е. И. Пашкович // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – 2014. – № 1. – С. 20–26.

6. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Драгічынскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – 575 с.

7. ***Сорокин, А. А.*** Аграрный вопрос в Западной Белоруссии. 1920–1939 гг. / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 201 с.

8. ***Вабішчэвіч, А. М.*** Планы польскіх улад па нацыянальна-культурнай асіміляцыі насельніцтва Палескага ваяводства (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч // Веснік Мазырскага дзярж. пед. універсітэта імя І. П. Шамякіна. – 2008. – № 1. – С. 45–49.

9. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 2011. Воп. 1. Спр. 67. Свидетельства о материальном положении, местожительстве и о рождении граждан за 1937–1939 годы.

10. ***Tomaszewski, J.*** Z dziejów Polesia : zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : PWN, 1963. – 208 s.

11. ***Литвинко, С. А.*** Симоновичи. История одной полесской деревни / С. А. Литвинко, В. Д. Губаревич. – Брест : Брестская типография, 2020. – 211 с.

12. ***Пашкович, Е. И.*** Краеведческие альманахи как источник по истории повседневности на Полесье в 30-е гг. XX в. / Е. И. Пашкович // Социокультурная жизнь: история повседневности : сборник мат. регион. научно-практ. конф., Брест, 27 нояб. 2015 г. – Брест : БрГУ, 2016. – С. 121–129.

13. ***Мараш, Я. Н.*** Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918–1939) / Я. Н. Мараш. – Минск : Беларусь, 1983. – 94 с.

14. ***Marszak, M.*** Przewodnik po Polesiu / M. Marszak. – Brześć nad Bugiem : Nakładem Oddziału Polskiego Tow. Krajoznawczego, 1935. – 160 s.

15. Города и районы Брестчины: история и современность. Ивановский район. – Брест : Брестская типография, 2017. – 839 с.

16. ***Мікуліч, Т.*** Янаўскія лабары / Т. Мікуліч // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 58–60.

17. ***Rąkowski, G.*** Czar Polesia / G. Rąkowski. – Pruszków–Warszawa : Rewasz, 2001. – 600 s.

18. ***Wysłouh, F.*** Echa Polesia / F. Wysłouch. – Łomianki : LTW, [2012?]. – 204 s.

19. ***Сцяпанава, А. Ф.*** Грамадска-палітычная дзейнасць асаднікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1920–1939 гг.) / А. Ф. Сцяпанава // Культура, наука, образование в современном мире : материалы V Междунар. науч. конф. – Гродно : ГГАУ, 2011. – С. 438–442.

20. ***Stobniak-Smogorzewska, J.*** Kresowe osadnictwo wojskowe, 1920–1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa : Rytm, 2003. – 418 s.

21. ***Яковчик, И. И.*** Закозель: земля и люди / И. И. Яковчик, И. И. Акинчиц, В.В. Зданович. – Барановичи : Укрупненная типография, 1999. – 83 с.

22. ***Шикула, Л.*** История деревни Хомск / Л. Шикула // Запісы Таварыства аматараў беларускай гісторыі імя Вацлава Ластоўскага. – Рыга, 2013. – Вып. 1. – С. 65–94.

23. “За польскім часам...”: Западная Беларусь в воспоминаниях современников / Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина; редкол.: Е. С. Розенблат (гл. ред.) [и др.]. – Брест : БрГУ, 2019. – 171 с.

24. ***Śleszyński, W.*** Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków : Avalon, 2014. – 335 s.

25. ДАБр. – Ф. 2011. Воп. 1. Спр. 29. Выписки из протоколов заседаний гминных управлений и рады.

26. ***Мисиюк, В. С.*** Крупные землевладельцы Западной Белоруссии в контексте общественной трансформации (1921–1939) / В. С. Мисиюк // Системная трансформация общества: инновации и традиции : сб. науч. тр. кафедр соц.-гум. наук. – Брест : БрГТУ, 2015. – Выпуск 11. – С. 62–66.

Паступіў у рэдакцыю 12.04.2024 г.
Кантакты: vitharmatny@mail.ru (Гарматны Віталь Пятровіч)

***Harmatny V. P.*** **NATIONAL COMPOSITION AND MATERIAL WELL-BEING OF POPULATION IN DRAGICHYN DISTRICT OF POLESIE VOIVODESHIP IN 1921–1939**

*The article examines the main national groups of the population of the Dragichyn District of the Polesie Voivodeship in 1921–1939, analyzes their professional employment, which became the main prerequisite for the level of material well-being and the specifics of the relationship between them.*

**Keywords**: Dragichyn District, nation, Belarusians, Poles, Jews, labary.